Источник: "Беларусь" - № 11, 2012-11-25



# ЗОРНЫ ШЛЯХ Алега Навіцкага




**У КАНЦЫ КАСТРЫЧНІКА З КАСМАДРОМА БАЙКАНУР СТАРТАВАЎ КАРАБЕЛЬ "САЮЗ ТМА-06М", КАМАНДЗІРАМ ЯКОГА СТАЎ НАШ ЗЯМЛЯК**



**Гэтага моманту з заміраннем сэрца чакалі не толькі родныя касманаўта, але і яго сябры, аднакласнікі, настаўнікі і проста знаёмыя. Адлік часу разам з членамі міжнароднага экіпажа вялі ўсе, хто прыпаў да экранаў манітораў. Дзесяць секунд, пяць, дзве, адна... старт. Нарэшце ракета выведзена на арбіту і можна ўздыхнуць з палёгкай. Мы ў чарговы раз сталі сведкамі таго, што для нашых людзей няма нічога немагчымага. Удвая прыемна, што космас беларусы пакаралі ўжо не аднойчы.**

## ШТО ЗА МІГАТЛІВЫМІ ЗОРКАМІ?

Пасля стыкоўкі, якая прайшла 25 кастрычніка, палёт экіпажа прадоўжыцца амаль пяць месяцаў. Разам з Алегам Навіцкім да Міжнароднай касмічнай станцыі адправяліся расіянін Яўген Тарэлкін і амерыканец Кевін Форд. За гэты час экіпаж правядзе на арбіце больш за паўсотню навуковых эксперыментаў, звязаных з медыцынай, прамысловасцю, агульнаадукацыйнай сферай. А ў вольны час каманда плануе заняцца фатаграфаваннем і відэаздымкай паверхні Зямлі. Калі атрымаецца, будуць працаваць над інтэрнэт-блогам.

Падчас прэс-канферэнцыі асноўнага экіпажа МКС-33/34 Алег Навіцкі прызнаўся, што ў дзяцінстве ён баяўся цемры. Каб прывыкнуць да яе, глядзеў на зорнае неба. Напэўна, у гэтыя моманты і зарадзілася дзіцячая мара — трапіць туды і паглядзець, што ж там знаходзіцца, сярод гэтых мігатлівых зорак. Ад свайго палёту наш зямляк чакае новых эмоцый: "Упэўнены, адчуванне будзе незабыўным — знаходзіцца на самай вяршыні гэтай вялікай канструкцыі, у якой столькі моцы, што нават страшна ўявіць!"

## СПАДАРОЖНІК — КАНТАКТ ЁСЦЬ!

Адносіны да космасу ў беларусаў асаблівыя і маюць даўнюю традыцыю. Да Алега Навіцкага ў космасе пабывалі двое беларусаў — Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак. Беларускія карані былі і ў першай жанчыны-касманаўта — Валянціны Церашковай. І сёння краіна не проста з цікавасцю назірае за палётам свайго земляка, але і сама спрабуе актыўна асвойваць Сусвет. Не так даўно быў запушчаны першы беларускі спадарожнік, а ў канцы жніўня здымкі з яго паступілі ў цэнтр апрацоўкі інфармацыі. Цяпер у Беларусі з'явілася самастойная сістэма дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі.

— Запуск беларускага спадарожніка стаў яркай іміджавай падзеяй для нашай краіны, прадэманстраваў наяўнасць у нас суперсучасных тэхналогій, навукаёмістых вытворчасцяў і аб'ектыўна ўнёс Беларусь у прэстыжны спіс касмічных дзяржаў, — лічыць дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Юрый Варатніцкі.

Цяпер у Беларусі рыхтуецца праект нацыянальнай касмічнай праграмы на 2013—2017 гады. Адпаведнае рашэнне прынята Прэзідыумам Нацыянальнай акадэміі навук. Сярод асноўных напрамкаў у новым дакуменце — развіццё сістэмы касмічнай сувязі.



"Беларусь". Зорны шлях Алега Навіцкага